11. *Гальченко М. Г.* Записи писцов в датированных древнерусских рукописях XIII–XV вв. // Palaeoslavica. 2003. № XI. С. 68–141.
12. Рэлігійнае пісьменства кірылічнай традыцыі XI–XV стст. Мінск : Беларус. навука, 2013.
13. *Столярова Л. В.* Свод записей писцов, художников и переплетчиков древнерусских пергаменных кодексов XI–XIV веков. М. : Наука, 2000.
14. *Лихачев Д. С.* Поэтика древнерусской литературы. 2-е изд. Ленинград : Худож. лит. Ленингр. отд-ние, 1971.
15. *Франклин С.* Письменность, общество и культура в Древней Руси: (около 950 – 1300 гг.). СПб. : Дмитрий Буланин, 2010.
16. *Гофман И.* Представление себя другим в повседневной жизни = The presentation self in every day life. М. : Канон-пресс-Ц, Кучково поле, 2000.

# СУЧАСНЫЯ ІНАВАЦЫЙНЫЯ ФОРМЫ ПРАВЯДЗЕННЯ ЭКСКУРСІЙ У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ: АНІМАЦЫІ І КВЭСТЫ

**Я. С. Патапенка**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*patapienka20@gmail.com;*
*навук. кір. – І. У. Алюніна, канд. гіст. навук, дац.*

Артыкул прысвечаны інавацыйным формам правядзення экскурсій у Рэспубліцы Беларусь – анімацыі і квэсту. Аналізуюцца найбольш запатрабаваныя інавацыі ў экскурсійнай дзейнасці Беларусі, разнастайныя прапановы беларускіх туркампаній. Аб’ектам даследавання з’яўляецца рынак інавацыйных прапаноў беларускага экскурсійнага турбізнесу. Актуальнасць даследавання абумоўлена канкурэнцыяй на рынку турыстычных паслуг, што вымушае распрацоўваць новыя віды і формы турпрадукта, прымяняць інавацыйныя тэхналогіі ў яго папулярызацыі і распаўсюджванні. Навуковая навізназаключаецца ў комплексным падыходзе да вывучэння разнастайных інавацыйных прапаноў у экскурсійнай дзейнасці музеяў, турфірм, лясгасаў, заказнікаў, нацыянальных паркаў, аграсядзіб і крэатыўных экскурсаводаў.

***Ключавыя словы***: інавацыі; квэст; анімацыя; экскурсія; сучасны беларускі турбізнес.

Беларусь – краіна з унікальным прыродным і культурным патэнцыялам, раскрыць які трэба не толькі ўласным жыхарам, але і турыстам з суседніх дзяржаў. Людзі пакідаюць свае дамы і рушаць увандроўкі, на экскурсіі, у адпачынак. Яны хочуць атрымаць незабыўныя ўражанні, эмоцыі і перажыванні, якія ўскалыхнуць душу. У канкурэнтнай барацьбе за экскурсанта турысцкія прадпрыемствы, якія працуюць на ўнутраным рынку, пачынаюць распрацоўваць новыя турпрадукты, якія з цягам часу становяцца папулярнымі ў беларускага спажыўца.

Сучаснае экскурсазнаўства вызначае экскурсію як мэтанакіраваны працэс пазнання чалавекам наваколля, які будуецца на загадзя падабраных аб'ектах у натуральных умовах пад кіраўніцтвам спецыяліста – экскурсавода [1, с. 14–15]. Але, у наш час класічнымі відамі экскурсій па родным краі ўжо немагчыма здзівіць патрабавальнага падарожніка. І каб зацікавіць турыста роднай гісторыяй, культурай і славутасцямі, турфірмам для распрацоўкі маршрутаў неабходна не тольківыкарыстоўваць сучасныя формы правядзення экскурсій і метады падачы матэрыялу, умець паказаць знаёмыя аб'екты ў новым ракурсе ці далучаць да турпрадукта новыя нечаканыя аб'екты і з'явы.

Інавацыйным прадуктаму экскурсійнай дзейнасці з'яўляюцца новыя па тэматыцы і форме экскурсіі, анімацыйныя і мультымедыйныя праграмы, інтэграваныя ў экскурсійныя маршруты, удасканаленыя класічныя экскурсіі, квэст-экскурсіі [2, с. 20].

Станаўленне айчынных экскурсійных анімацыйных праграм ішло марудна і з вялікімі цяжкасцямі. Спачатку ў экскурсіі дадаваліся асобныязабаўляльныя элементы, напрыклад, віктарыны, дэгустацыі, музычныя нумары і тэатральныя сцэнкі. Потым з'явіліся і паўнавартасныяанімацыйныя праграмы.

Пачынальнікам анімацыйнага руху ў турызме Беларусі па праву можна лічыць экскурсавода-аніматара, кіраўніка Фонду «Краіна замкаў» (http://zamak.by) Аляксандра Варыкіша. У пачатку 2000-х ён праводзіў захапляльныя экскурсіі ад імя шляхціча, а з 2006 г. пачынае выкупляць закінутыя сядзібы, аднаўляць і выкарыстоўваць іх у якасці тураб'ектаў. Аляксандр з паплечнікамі стварае шэраг анімацыйных праграм, у якія ўключае адрэстаўраваныя будынкі, як месца гістарычных падзей сваіх анімацый, правядзення дэгустацый, майстар-класаў, фэстаў, фаер-шоу і іншых забаўляльных мерапрыемстваў, якімі насычаны створаныя ім экскурсіі: «Шляхецкая гісторыя», «Шлях караля Міндоўга», «Таямніца Вялікага князя», «Шляхецкія ваколіцы». Пару гадоў таму разам з гісторыкам Ігарам Мельнікавым была распрацавана экскурсія-шоу «Дарогамі кантрабандыстаў».

Сярод турфірм, якія першымі пачалі выкарыстоўваць у сваёй працы новыя формы экскурсій, варта адзначыць лідскую фірму «Святавіт», сёння гэта – «Адрес Лета». Яны распрацавалі цыкл анімацыйных праграм пад агульнай назвай «Вялікае княства». Да гэтага часу не сціхае попыт на самыя першыя інтэрактыўныя прапановы «Свадьба короля Ягайло» і «Княжеский суд», якія праводзяцца ў Лідскім замку. Пазней была распрацавана яшчэ адна інтэрактыўная праграма «Майстэрня

Містра», якая прыцягвае да сябе ўвагу нечаканай і жудаснай тэмай – тэмай вязніцы і камеры катаванняў.

Найбуйнейшая турыстычная кампанія нашай краіны – турысцка-экскурсійнае ўнітарнае прадпрыемства «Беларустурыст» – распрацавала шэраг інавацыйных маршрутаў па Беларусі на 2018 год.

Ва ўсіх абласных цэнтрах існуюць турысцка-экскурсійныя даччынныя ўнітарныя прадпрыемствы, якія прапаноўваюць свае распрацоўкі.

«Гроднатурыст» прапаноўвае анімацыйную кулінарную праграму з дэгустацыяй страў беларускай нацыянальнай кухні і майстар-класам па прыгатаванні бабкі «У гасцях у Пані Пышкі», якая праходзіць у турысцка-аздараўленчым комплексе «Пышкі».

«Магілёўтурыст» стварыў анімацыйную праграму з элементамі кулінарнага шоу «Забавы у Любавы», экскурсію з анімацыяй «Дворцовые тайны князя Потемкина» і квэст-экскурсію «Тайны города на Днепре». Туркампанія не прапаноўвае вырашыць складаныя і стамляльныя галаваломкі, а запрашае паглыбіцца ў цудоўную атмасферу гульні, дзе ва ўсіх удзельнікаў будзе індывідуальная роля і агульная мэта – даведацца пра Магілёў як мага больш!

«Віцебсктурыст» запрашае на аглядную экскурію па Віцебску з элементамі анімацыі «Город, восставший из пепла», якая ўключае экскурсію-анімацыю ў музеі Героя Савецкага Саюза М. Ф. Шмырова; у сядзібу-музей «Здраўнёва» да сям’і Рэпіна на шоу «Здравнёвские вечера».

Экскурсію па Гомелю з элементамі анімацыі «Маршрут фельдмаршальский» распрацавалі супрацоўнікі «Гомельтурыста». Маршрут уключае падрабязны агляд шэдэўраў гарадской палацава-паркавай архітэктуры.

Трэба адзначыць, што большасць з распрацаваных праграм яшчэ не апрабіравана на практыцы, таму сезон адпачынку 2018 года пакажа, наколькі цікавымі і канкурэнтаздольнымі будуць прапанаваныя турпаслугі.

Анімацыйныя тэхналогіі актыўна выкарыстоўваюцца ў дзейнасці музейных устаноў. Роля пасіўнага назіральніка змяняецца роляй актыўнага ўдзельніка працэсу пазнання. Піянерам інавацыйных змяненняў у музейнай практыцы можна па праву лічыць Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж». Супрацоўнікамі музея распрацаваны некалькі квэст-экскурсій, якія раскрываюць таямніцы палаца ў гульне, дазваляюць наведаць тыя аб’екты, якія недаступны пры звычайных аглядных экскурсіях і заахвочваюць неаднаразова наведваць комплекс. Тэатралізаваныя гістарычныя квэсты «Таямніцы Нясвіжскага

палаца» і «Таямніцы і загадкі палаца Радзівілаў» дазваляюць спусціцца ў сутарэнні і пабачыць княжацкія пакоі палаца, якія закрыты для турыстаў.

Не адстае ў барацьбе за кліента ад музея-запаведніка «Нясвіж» і замкавы комплекс «Мір». Займальны квэст «Белы слон», тэатралізаваная экскурсія «І зноў ажываюць паданні…», экскурсія з элементамі дэгустацыі «Пане Каханку», дзіцячая тэатралізаваная экскурсія «Чароўная гісторыя ў Мірскім замку» робяць наведванне эксклюзіўным і непаўторным.

Музейныя тэатралізаваныя святы – інавацыя, якая стала дастаткова папулярнай на турыстычным рынку. Многія музеі, у тым ліку Мірскі і Нясвіжскі замкі прапаноўваюць наведвальнікам навагоднія анімацыйныя праграмы. А філіял Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы «Вязынка», гісторыка-культурны музей-запаведнік «Заслаўе» і Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту на працягу года ладзяць традыцыйныя абрадавыя святы «Каляды», «Масленіцу», «Гуканне вясны», «Купалле» і «Багач», на якіх экскурсанты становяцца актыўнымі ўдзельнікамі тэатральнай дзеі.

Пра папулярнасць гэтых турыстычных аб’ектаў можа сведчыць тое, што ўсе фірмы, якія займаюцца ўнутраным турызмам, уключаюць іх у свае маршруты.

Адна з мінскіх фірм, якая актыўна прапагандуе новыя формы правядзення экскурсій – экскурсійнае бюро «Вежа». Імі была распрацавана ў межах гарадскога квэста экскурсія па Мінску, якая была створана на аснове класічнай экскурсіі па Мінску і праводзіцца як для арганізаваных груп, так і для зборных, да якіх можа далучыцца любы жадаючы. Квэст прыцягвае турыстаў цікавымі пытаннямі, галаваломкамі і нестандартным маршрутам. Ажыўляюць гісторыю горада і анімацыйныя персанажы прыгожай шляхцянкі, прадпрымальнага габрэя, памочніка гарадскога галавы. Гэты квэст часта заказваюць для адпачынку і святкаванняў значных падзей як сем’і, так і працоўныя калектывы.

Аналіз рынка экскурсійнага турызму Беларусі паказаў, каб прывабіць кліента, і фірмы, і дзяржаўныя ўстановы вымушаны не толькі паляпшаць якасць абслугоўвання кліентаў, прымяняць сучасныя тэхналогіі, але і ствараць новы турпрадукт, разлічаны на розныя катэгорыі грамадзян.

Павышэнне эфектыўнасці турызму ў Рэспубліцы Беларусь немагчыма без укаранення ў практычную экскурсійную і турыстычную дзейнасць разнастайных інавацый. Яны пашыраюць культурную базу гістарычнай спадчыны, дадаюць новыя формы яе інтэрпрэтацыі, дапамагаюць перавесці на якасна новы ўзровень турысцкі сэрвіс і ў канчатковым

выніку дазваляюць паспяхова канкурыраваць у сферы культурна-пазнавальнага турызму з іншымі краінамі і рэгіёнамі.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. *Емельянов Б. В.* Экскурсоведение : учеб. 5-е изд. М. : Совет. спорт, 2004.
2. *Чирский Н. А., Хвагина Т. А.* Инновации в экскурсионной деятельности // Туризм и гостеприимство : науч.-практ. журнал. 2015. № 2. С. 20–27.

# К ВОПРОСУ ОБ ИСТОРИИ И УНИФОРМЕ ПОЛКА ФУЗИЛЕР-ГРЕНАДЕР ИМПЕРАТОРСКОЙ ГВАРДИИ (1806–1814 гг.)

**Д. К. Раков**

*Белорусский государственный университет, г. Минск;*
*dmitry_rakov@mail.ru;*
*науч. рук. – А. А. Гужаловский, д-р ист. наук, проф.*

В статье рассматривается история полка фузилер-гренадер – одного из подразделений гвардии Наполеона I, принимавшего активное участие в сражениях наполеоновской эпохи, анализируется организация и эволюция униформы этого полка, службу в котором проходил ряд французских мемуаристов, деятелей культуры.

***Ключевые слова*:** фузилеры-гренадеры; Императорская гвардия; униформа; Бургонь, полк.

Императорская гвардия – элитная, привилегированная часть армии Наполеона, сформированная им в 1804 г. Являясь образцом для армейских подразделений, она отличалась высокой дисциплиной и боевой выучкой. Обеспечивая охрану императора, полки гвардии достойно показали себя во многих сражениях наполеоновской эпохи.

15 декабря 1806 г. по декрету Наполеона создается 2-й полк фузилеров гвардии, командиром которого вскоре стал майор гвардии Ж.-П. Фридерике (1773–1813) [1, с. 200; 2, рис. 472]. Полк был создан из т.н. велитов[1] пеших гренадер и пеших егерей, а также формировался за счет призывников из резервных департаментных рот [4, рис. 4]. 2-й полк стал впоследствии называться фузилерами-гренадерами[2]. Состав 2-го фузилерного полка – два 4-ротных батальона, а также одна рота в депо. Общая численность полка составляла около 1200 человек. Подразделение было причислено по статусу к Молодой гвардии, а по назначению – к корпусу пеших гренадер [3, с. 534; 5, рис. 10].

Изобразительным источником, демонстрирующим первоначальную униформу 2-го фузилерного полка гвардии, является акварель, приписывающаяся авторству немецкого художника К.-В. Кольба (Старшего?,

---

[1] Название было взято из древнеримской традиции. Велитами при Наполеоне называли вступивших в гвардию добровольцев из обеспеченных призывников. Фактически являлись пополнением для гвардии, служба в которой для велитов была чем-то на подобие ускоренной военной школой [3, с. 443].
[2] 1-й полк фузилеров гвардии позже стал называться полком фузилеров-егерей [3, с. 535].